■ Наўздагон

# Прыцэл на 2020

### Бразільскія ўрокі дапамогуць лепш падрыхтавацца да наступных Алімпійскіх гульняў у Токіа



**Першы намеснік міністра спорту і турызму краіны, шэф беларускай дэлегацыі ў Бразіліі Аляксандр ГАГІЕЎ падвёў вынікі выступлення нашых спартсменаў у Рыа-дэ-Жанейра. Як і большасць спартыўных чыноўнікаў, ён выказаў думку, што беларуская зборная нядрэнна паказала сябе на галоўных стартах чатырохгоддзя.**

*— Напярэдадні Гульняў мы вырашылі ўсе пытанні па забеспячэнні нацыянальных камандаў. І самааддача, якую прадэманстравалі спартсмены, сведчыць сама за сябе. Усе ставілі максімальныя задачы. Разам з тым маем тое, што маем — 9 медалёў. Магчыма, не тая колькасць, якую хацелася б, але ў цэлым выступілі годна,* — сказаў ён.

Першы намеснік міністра падкрэсліў, што па выніках Алімпіяды кожны трэці беларускі атлет аказаўся ў васьмёрцы наймацнейшых. Вельмі парадавалі прадстаўнікі вольнай і грэка-рымскай барацьбы. Атлеты ў гэтых відах выйгралі медалі, якія не ўдалося ўзяць у Лондане, дзе было адразу некалькі пятых месцаў. Таксама Аляксандр Гагіеў не абышоў увагай выступленне жаночай баскетбольнай каманды.

*— Дзяўчаты, на мой погляд, выступілі годна: трапіць у гульнявых відах спорту на Алімпіяду, аказацца ў ліку 12 найлепшых у свеце — ужо вялікае дасягненне.*

Таксама Гагіеў падкрэсліў, што, нягледзячы на бытавыя складанасці ў Бразіліі, пра якія ўжо гаварылася шмат, і дзякуючы дысцыпліне ў алімпійскай камандзе, у Рыа абышлося без асаблівых здарэнняў, якіх не ўдалося пазбегнуць іншым зборным.

Першы намеснік міністра Аляксандр Славіевіч адзначыў, што медальны вынік мог быць і лепшым, але негатыўныя фактары, якія паўплывалі на каманду перад самым ад'ездам на Алімпіяду, перашкодзілі заваяваць большую колькасць узнагарод. Асноўнымі прычынамі сталі адхіленне нашых спартсменаў з прычыны допінгавых скандалаў. Працэс абароны айчынных атлетаў працягваецца і сёння. У Міжнародным спартыўным судзе ў Лазане знаходзяцца два іскі беларускага боку. Першы тычыцца адхілення ад летняй Алімпіяды мужчынскай каманды каноістаў, другі іск — з нагоды цяжкаатлетаў. Чакаецца, што гэтыя пытанні будуць разгледжаны ў верасні-кастрычніку.

Яшчэ адзін скандал спасціг нашага таэквандыста ўжо падчас Алімпіяды. Напярэдадні вылету ў Рыа-дэ-Жанейра ў Армана-Маршала Сілы ў арганізме былі выяўлены забаронены прэпарат — мельдоній.

*— Падрабязнасцяў паведамляць не хачу, дэталяў пакуль няма. Ідзе расследаванне, якое праводзіцца Нацыянальным антыдопінгавым агенцтвам, кампетэнтныя органы таксама гэтым пытаннем займаюцца. Гэта быў чарговы ўдар нам у спіну — ці то з боку міжнародных арганізацый, а можа, нават і ад сваіх. Нікога не хачу пакуль вінаваціць, рэзкія заявы рабіць не буду. Нават калі гэта здарылася па халатнасці, нават калі хтосьці яму рэчыва гэтае падліў, абвінавачванні з атлета не здымаюцца. Прычым такой вялікай канцэнтрацыі мельдонію, якая зафіксавана ў Армана, не было ні ў кога з усёй каманды,* — распавёў Аляксандр Гагіеў.

Яшчэ адно праблемнае пытанне, пра якое казаў Аляксандр Славіевіч, датычыцца відаў спорту, якія ў краіне страчваюць свае пазіцыі — плаванне і лёгкая атлетыка. На яго думку, праблемы тут у тым, што спартсмены не змаглі выйсці на пік формы, але больш дэталёвы разбор яшчэ трэба будзе зрабіць кожнай федэрацыі асобна.

На прыкладзе спартыўнай гімнастыкі закранулі праблему не заўсёды апраўданай і ўдалай натуралізацыі спартсменаў. Гімнастка з ЗША Кайлі Дыксан, якая на Алімпійскіх гульнях прадстаўляла нашу краіну, заняла толькі перадапошняе месца.

*— Амерыканка выступіла не зусім удала. Але яна прыехала ў Рыа з траўмай. Прычым сама пра яе не ведала. Ужо на месцы нашы лекары заўважылі нядобрае, паколькі спартсменка скардзілася на дыскамфорт. Зрабілі МРТ. Выявілі расколіну ў ступні. Чакаць ад яе выступлення чагосьці звышнатуральнага было складана, але хацелася б большага, чым перадапошняе месца.*

*Мы ўжо зрабілі высновы. Першапачаткова, магчыма, пайшлі на повадзе ў людзей, якія прапаноўвалі натуралізацыю, з улікам нашай безвыхаднасці ў спартыўнай гімнастыцы. Стаўка рабілася на тое, што гэтыя дзве амерыканскія спартсменкі дапамогуць нашым падцягнуцца, стаць больш упэўненымі. Цяпер разумеем, што, напэўна, памыліліся. У будучыні будзем больш педантычна падыходзіць да такіх пытанняў. Кантраляваць, каб хоць заключныя этапы падрыхтоўкі прывезеныя спартсмены праводзілі ў Беларусі,* — сказаў Аляксандр Гагіеў.

Нагадаем, беларуская зборная на сёлетніх Алімпійскіх гульнях заваявала 9 узнагарод і заняла 40-е месца ў агульнамедальным заліку.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# Суцэльная хваля «шэрых» агентаў

### Ад дэмпінгу да махлярства — адзін крок

Спецыялісты рынку жыллёвай нерухомасці паведамляюць, што сёння кожны трэці «шэры» агент дзейнічае без ведама ўладальнікаў кватэр, бо збірае інфармацыю з адкрытых крыніц, пасля чаго размяшчае аб'явы з указаннем асабістых кантактаў. Многія агенты-адзіночкі працуюць з уласнікамі наўпрост, а каб заручыцца іх падтрымкай, актыўна звяртаюцца да свабоднага цэнаўтварэння (у адрозненне ад рыэлтарскіх арганізацый, яны могуць выкарыстоўваць любыя тарыфы). У выніку даходзіць да абсурду, калі адзін і той жа чалавек прадае 15-20 кватэр. Тут трэба адзначыць, што падобныя спецыялісты-індывідуалы не страхуюць правядзенне сваіх здзелак ад форс-мажорных выпадкаў, а таксама яны не плацяць адпаведныя падаткі і зборы ў дзяржаўную казну.

Наш эксперт прагназуе, што ў найбліжэйшай будучыні мінчане і ўвогуле могуць сутыкнуцца з засіллем нелегальных пасярэднікаў, а «шэрых» агентаў пачнуць змяняць «чорныя рыэлтары» — тыя, што выкарыстоўваюць заведама ашуканскія схемы. «Калі сітуацыя не зменіцца, то не выключана, што мы можам сутыкнуцца з негатыўным вопытам расійскіх гарадоў, у якіх квітнеюць «чорныя маклеры», а тэма жылля не пакідае крымінальных зводак. Пакуль, вядома, сітуацыя ў Беларусі далёкая ад крытычнай, але тэндэнцыя насцярожвае», — патлумачыў сваю пазіцыю Мікалай Прасталупаў.

**Падобныя спецыялісты-індывідуалы не страхуюць правядзенне сваіх здзелак ад форс-мажорных выпадкаў, а таксама яны не плацяць адпаведныя падаткі і зборы ў дзяржаўную казну.**

### Шанц «адбяліць» рынак

Выправіць сітуацыю на другасным рынку жылля эксперт прапануе без нейкіх жорсткіх метадаў, а выключна звычайным чынам: патрабаваць ад аўтара аб'явы аб продажы нерухомасці пацвярджэння, што ён з'яўляецца ўласнікам жылля або атрымаў ад апошняга даверанасць на продаж кватэры. Акрамя таго, да агентаў-адзіночак павінны прад'яўляцца тыя ж патрабаванні, што і да рыэлтарскіх арганізацый. «Пакуль тут няма раўнавагі. Чым больш ціск аказваюць на легальны сектар, тым хутчэй расце ценявы. Так працуе эканоміка ў любой краіне свету», — падкрэслівае спецыяліст.

Паводле яго слоў, рыэлтарскія арганізацыі, у адрозненне ад вольных агентаў, за кожнае дзеянне адказваюць рублём, а ў выпадку чаго могуць пазбавіцца ліцэнзіі і пакінуць рынак. «Афіцыйнаму агенцтву нерухомасці ёсць што губляць: ад таго, наколькі прафесійна яно працуе з кліентам, залежыць яго лёс на рынку. Тым самым спажывец атрымлівае пэўныя гарантыі і можа быць упэўнены ў якасці працы. А вось пры супрацоўніцтве з «шэрым» маклерам чалавек можа разлічваць толькі на ўдачу», — лічыць спадар Прасталупаў.



Спецыялісты арганізацый асацыяцыі ўпэўнены, што «шэрыя» пасярэднікі могуць падарваць давер у кліентаў да рынку жылля. «Калі чалавек сутыкнуўся з нядбайным агентам-адзіночкай, у яго складваецца лжывае ўяўленне аб усіх удзельніках рынку жылля. Такіх выпадкаў усё больш, і ад іх, у канчатковым выніку, могуць пацярпець і тыя, хто працуе прафесійна і адказна», — адзначыў старшыня савета.

**«Улетку было зафіксавана 1,3—1,4 тысячы здзелак у месяц, у 2016 годзе іх агульная колькасць можа дасягнуць 15 тысяч, што нашмат перавышае паказчыкі 2013-2014 гадоў, якія да гэтага часу лічыліся рэкорднымі».**

### Рэкорды актыўнасці

Мікалай Прасталупаў паведаміў, што айчынны рынак жылой нерухомасці, пачынаючы з лета, істотна ажывіўся, і па выніках года можа быць зарэгістравана рэкордная колькасць здзелак, аднак цэны працягнуць зніжацца і ў наступныя месяцы.

Цяпер на рынку назіраецца цікавая сітуацыя, калі спецыялісты сутыкнуліся з небывалай колькасцю здзелак. «Улетку іх было зафіксавана 1,3—1,4 тысячы ў месяц, і ў жніўні сёлета рост працягваўся», — паведаміў кіраўнік асацыяцыі. Больш за тое, на яго думку, у 2016 годзе агульная колькасць здзелак можа дасягнуць 15 тысяч, што нашмат перавышае паказчыкі 2013-2014 гадоў, якія да гэтага часу лічыліся рэкорднымі.

Эксперт таксама канстатаваў, што ў апошнія месяцы запавольлася і тэндэнцыя да зніжэння цэн на жыллё. «Цяпер можна чакаць такога зніжэння тэмпаў у памеры каля 1% у месяц, і я думаю, што да новага года будзе такая сітуацыя», — дадаў ён. Паводле яго слоў, не варта чакаць росту цэн і на рынку новабудоўляў. Сёння на першасным рынку жылля забудоўшчыкі спыніліся на цэнніку ў тысячу долараў за квадратны метр, што лічыцца мінімальнай гранічнай мяжой. «Сітуацыя магла б змяніцца, калі б было больш удзельнікаў, але іх няма», — сказаў Прасталупаў. Ён падкрэсліў, што адсутнасць дастатковай прапановы на першасным рынку жылля будзе «вялікім тормазам» для істотнага далейшага зніжэння коштаў на кватэры на другасным рынку Мінска.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Факт

## Ліда зноў стала «статысячнікам»

**Гэты статус быў страчаны горадам у 2003 годзе, калі колькасць насельніцтва склала 99 810 чалавек.**

А на 1 студзеня сёлетняга года ў райцэнтры, згодна з інфармацыяй аддзела статыстыкі Лідскага раёна, зарэгістраваны 100 443 жыхары. Вось як гэтая лічба выглядае ў параўнанні з апошнімі гадамі: у 2012-м гараджан было 98 744, у 2013-м — 99 430, у 2014-м — 99 928, у 2015-м — 99 976.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## З пасткамі — на норку

**З 1 верасня ў краіне пачаўся сезон палявання на амерыканскую норку і андатру.**

Асаблівасць сезона, які будзе доўжыцца да 31 сакавіка, — бязвзбройны спосаб здабычы дзічыны. Паляваць можна на жывёл любога полу і ўзросту пры дапамозе капканаў №0-3 і пастак (акрамя сілаў). Здабываць амерыканскую норку і андатру збройным спосабам будзе дазволена з пачаткам масавага палявання на пушную дзічыну — з першай суботы лістапада і па апошнюю нядзелю студзеня ў светлы час сутак.

## Б'юцца маршруткі...

**На вуліцы Солтыса ў сталіцы маршрутнае таксі ўрэзалася ў слуп. Мікрааўтобус сутыкнуўся з аўтамабілем «Рэно», што разварочваўся на скрыжаванні, і ад удару яго адкінула на слуп. З 15 пасажыраў пацярпелі шэсць. Ад шпіталізацыі яны адмовіліся з прычыны лёгкіх траўмаў.**

Літаральна ж днямі ў аварыі на 15-м кіламетры Магілёўскай шашы пацярпелі восем чалавек, калі маршрутка Старыя Дарогі — Мінск сутыкнулася з грузавіком. Усяго ў транспартным сродку знаходзіліся 17 чалавек. Па звестках Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС, кіроўца 1979 года нараджэння быў дэблакіраваны ратаўнікамі пры дапамозе гідраўлічнага інструмента. Яго шпіталізавалі ў Мінскую абласную клінічную бальніцу з меркаваным дыягназам «адкрыты пералом левай малой галёначнай косці і ўдарам ніжняй губы». Чатыры чалавекі з ліку пасажыраў з ударамі лёгкай ступені накіравалі ў гэтую ж медустанову для агляду, яшчэ аднаго даставілі ў 10-ю гарадскую клінічную бальніцу. Два пасажыры адмовіліся ад шпіталізацыі, дапамогу ім аказалі на месцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# Выхадцы з Каўказа пакінулі лагер на беларуска-польскай мяжы

**Чачэнцы і дагестанцы цэлымі сем'ямі жывуць у Брэсце недзе з канца вясны. Яны прыязджаюць у горад, здымаюць кватэры альбо засяляюцца ў гасцініцы. Кожны дзень людзі садзяцца ў цягнік Брэст — Цярэспаль і едуць у Польшчу. Вечарам абсалютная большасць вяртаецца назад. Грамадзяне суседняй дзяржавы не стамляюцца рабіць спробы атрымаць статус бежанца, трапіць у спецыяльны лагер, а потым растварыцца ў Еўрасаюзе. Як правіла, штодзень такую магчымасць атрымліваюць ад пяці да пятнаццаці чалавек. Астатнія вяртаюцца ў Брэст і назаўтра пачынаюць зноў.**

Паводле нашых законаў, грамадзяне Расіі могуць знаходзіцца ў нас да 90 дзён без рэгістрацыі. Вось і жывуць, пакуль хапае грошай на пражыванне ды старонак у пашпарце для памежных адзнак. І пакуль ёсць надзея, якую падтрымлівае прыклад тых пяці альбо пятнаццаці, якім шанцуе застацца.

...У нейкі момант градус напружання ў асяродку прыезджых вырас настолькі, што грамадзяне арганізаваліся і ўтварылі стыхійны лагер каля аўтамабільнага пункта пропуску «Брэст». Людзі пачалі збірацца там перад абедам 29 жніўня. Жанчыны з дзецьмі размяшчаліся на коўдрах і посцілках. Мужчыны сядзелі побач. Такім чынам яны хацелі прыцягнуць увагу польскага боку ды і грамадскасці наогул да іх праблем, спадзяваліся сустрэцца з прадстаўніком польскага консульства. Адным словам, ноч на зямлі правялі каля дзвюх соцень чалавек, у іх ліку былі нават дзеці ва ўзросце да года.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **кіраўнік прэс-службы Брэсцкай памежнай групы Аляксандр КІСЛОЎ**, 30-га ўвечары грамадзяне стыхійны лагер пакінулі. Прычыну такога рашэння патэнцыяльных бежанцаў у памежным ведамстве назваць не змаглі, толькі адзначылі, што з іх боку не зафіксавана якіх-небудзь парушэнняў заканадаўства альбо грамадскага парадку. Ён таксама пацвердзіў факт, што ўсе гэтыя людзі шмат разоў спрабавалі перасячы мяжу, але беспаспяхова.

Аляксандр Кіслоў дадаў, што ў апошнія дні адзначаецца значны спад патоку бязвізавых мігрантаў. Калі на пачатку месяца штодзень выязджала 700-800 чалавек, то цяпер на цярэспальскія цягнікі бяруць білеты 300-350 чалавек за дзень у спадзяванні на станоўчае вырашэнне хадайніцтва аб атрыманні статусу бежанца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**